УДК 808.26-3

# Лексіка-семантычная структура ідыялекту

Пятрова Н.Я.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Даследаванне ідыялекту знаходзіцца ў непарыўным адзінстве з вывучэннем моўнай асобы – яго носьбіта, таму лексіка-семантычная структура ідыялекту непарыўна звязана з асобай аўтара. Моўная асоба, абапіраючыся на сродкі этнамовы, стварае свой ідыялект, аналіз якога ў сваю чаргу дае магчымасць ахарактарызаваць асобныя рысы моўнай асобы носьбіта ідыялекту. На станаўленне моўнай асобы і ідыялекту ўплываюць экстралінгвістычныя фактары: гендэрныя адрозненні, сацыяльны статус моўнай асобы, тэрытарыяльная прыналежнасць, тыпы моўных асоб бацькоў і настаўнікаў, адукацыя моўнай асобы, гістарычны і культурны кантэкст эпохі, сацыяльная рэчаіснасць, жыццёвы вопыт, інтарэсы моўнай асобы, асабісты эстэтычны густ, псіхалагічныя асаблівасці і інш.

Сутнасць паняцця *ідыялект* зводзіцца ў наступнае азначэнне: ідыялект – сукупнасць моўных сродкаў, якія паводле аўтарскай інтэнцыі адлюстроўваюць фрагмент індывідуальнай карціны свету. Ідыялект з'яўляецца сістэмным утварэннем. Кожная падсістэма (фанемная, лексічная, марфалагічная, сінтаксічная) валодае сваёй структурай – сукупнасцю ўнутрысістэмных сувязей паміж элементамі, з якіх складаецца. Асноўнай ў складзе ідыялекту з'яўляецца лексічная падсістэма, у якой праяўленне індывідуальнасці моўнай асобы знаходзіць найбольшую канцэнтрацыю. Слова, атрымліваючы рэалізацыю ў аўтарскіх тэкстах, уступае з іншымі словамі ў розныя сэнсавыя кантакты. Гэта дае падставы замест тэрміна ‘лексічная падсістэма ідыялекту’ выкарыстаць назву ‘лексіка-семантычная падсістэма’.

Лексіка-семантычная структура ідыялекту – гэта ўпарадкаваная сістэма лексічных адзінак (аказіянальных і ўзуальных) з усімі сувязямі і адносінамі паміж імі, якая адлюстроўвае фрагмент індывідуальнай карціны свету моўнай асобы. Лексіка-семантычная структура ідыялекту арганізавана па палеваму прынцыпу. Цэнтр структуры займаюць наватворы, а таксама словы агульнанароднай мовы, якія паводле аўтарскай інтэнцыі атрымалі кантэкстуальнае пераўтварэнне. У зону перыферыі ўваходзяць адзінкі, якія высвятляюць рысы моўнай асобы як рэальнага чалавека: блізкую перыферыю арганізуюць ключавыя словы і сродкі выражэння ацэначнай семантыкі, якія адлюстроўваюць аўтарскае светабачанне; далёкую перыферыю ўтвараюць словы, якія адлюстроўваюць носьбіта ідыялекту як прадстаўніка пэўнага гістарычнага, сацыяльнага і этнакультурнага асяроддзя.